УДК 37(476)"15/17":[37.017.4:27–788]

**А. Ф. Самусік,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ*

# АРГАНІЗАЦЫЯ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў МАНАСКІХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVI – СЯРЭДЗІНЕ XVIII ст.

Рэпазіторый БДЭУ

Навучальныя ўстановы манаскіх ордэнаў займаюць пачэснае месца ў гісторыі еўрапейскай педагогікі. Менавіта яны на працягу XIII–XVIII стст. зрабілі шмат карыснага для ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, аб'яднаўшы сярэдневяковыя septem artes liberalis са studia humanitatis эпохі Адраджэння. Пры гэтым, адкрываючы ўласныя школы ў розных краінах Еўропы, манахі былі вымушаны прыстасоўвацца да патрэб мясцовага грамадства, што паступова размывала ўласцівы ім «хрысціянскі касмапалітызм» і надавала пэўную грамадзянска-патрыятычную афарбоўку іх вучэбным праграмам. Асабліва паскорыўся гэты працэс у эпоху Асветніцтва, калі ордэнскія вучылішчы шмат дзе секулярызаваліся. Апошняе дазволіла перадаць назапашаны імі педагагічны вопыт свецкім школам, што робіць сучасны зварот да аналізу эвалюцыі манаскай адукацыі ў цэлым і арганізацыі тут выхаваўчага працэсу ў прыватнасці яшчэ больш актуальным. Неабходна таксама падкрэсліць, што на беларускіх землях тыя ж езуіты, піяры, дамініканцы і базыльяне фактычна манапалізавалі асветніцкую справу ў XVII – сярэдзіне XVIII ст., а таму вывучэнне спецыфікі іх дзейнасці ў рэгіёне дазваляе куды лепш зразумець агульныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага жыцця ў Рэчы Паспалітай.

У цэлым роля манаскай педагогікі ў гісторыі айчыннай адукацыі знайшла сваё адлюстраванне ў беларускай гістарыяграфіі, дзе асаблівая ўвага ў гэтай сувязі прысвечана езуітам [1; 2] і базыльянам [3; 4]. Шэраг навукоўцаў разглядае іх дзейнасць у комплексе, што дазваляе лепш зразумець агульныя тэндэнцыі і асноўныя напрамкі эвалюцыі зместу выкладання [5; 6]. Падобны падыход пануе і ў замежнай гістарыяграфіі, якая пры гэтым разглядае сутнасць манаскай асветы на больш вялікіх прасторах [7; 8]. Трэба, аднак, прызнаць, што праблема патрыятычнага выхавання ў азначаных даследаваннях разглядаецца толькі ўскосна і свайго належнага асвятлення так і не знайшла.

Манаскія ордэны ў ВКЛ пачалі з'яўляцца з канца XIV ст. Першымі сюды прыбылі ў 1390 г. францысканцы (Вільня), за імі ў 1469 г. бернардзінцы (Вільня), і ў 1474 г. – дамініканцы (Астравец) [9, с. 189–192, 212–214, 268–269]. Аднак працяглы перыяд іх асветніцкая дзейнасць не выходзіла за межы сталіцы, дзе першыя з іх заснавалі сваю школу не пазней за 1426 г., другія – у канцы XV ст., а трэція ўтрымлівалі багаслоўскую студыю з 1507 г. [10, с. 133]. Арганізацыя ў іх навучання не прадугледжвала патрыятычнага выхавання – большасць прадметаў мела багаслоўскае напаўненне, а граматыка і рыторыка служылі выключна для дасканалага валодання латынню. У вучобе на першае месца ставілася вернасць каталіцкай рэлігіі і Ватыкану, а не ўласнаму манарху, паняцце ж «айчына» падмянялася надэтнічным «хрысціянскім светам».

Мала змянілася сітуацыя і пасля заснавання ў 1540 г. езуіцкага ордэна. Утвораны для барацьбы з рэфармацыйным рухам, ён вызначаўся надзвычайным кансерватызмам і змагаўся з любой праявай навацый эпохі Адраджэння. Езуіты негатыўна ставіліся да выкладання «нацыянальных» прадметаў – мясцовых моў і свецкай гісторыі, прычым апошняя, на іх погляд, «служила гибелью тому, кто ее изучает» [11, с. 128]. Частковая карэкцыя падобных поглядаў адбылася пасля пачатку іх пашырэння за межы Італіі. Для замацавання ў той ці іншай краіне яны былі вымушаны ўлічваць ідэалагічныя інтарэсы тутэйшай правячай эліты, якія манахі аб'яднoўвалі з маральнымі прынцыпамі хрысціянства. Праз усю сістэму езуіцкай адукацыі стала праходзіць ідэя аб прызначэнні дзяржаўнай улады для дабрабыту народа і ўсеагульнай роўнасці перад законам. Сцвярджалася, што кожны пры неабходнасці павінен прынесці сябе і ўласную маёмасць у ахвяру Радзіме, а здрада ёй – гэта злачынства супраць Бога [12, с. 82].

Трэба адзначыць, што падобная «патрыятычная» рыторыка прыйшлася да спадобы ў тым

ліку і магнатэрыі ВКЛ, што спрыяла хуткаму пашырэнню езуіцкіх школ у краіне. Створаны імі ў 1569 г. калегіум у Вільні ўжо праз 10 год атрымаў статус акадэміі і правы, роўныя Кракаўскаму ўніверсітэту. Хутка развівалася, дзякуючы прыватным ахвяраванням, і сетка езуіцкіх навучальных установаў на беларускіх землях – яны былі адкрыты ў Полацку (1581), Нясвіжы (1584), Оршы (1617–1618), Брэсце (1620–1621), Гродне (1625–1626), Пінску (1634–1635), Віцебску (1648–1649), Навагрудку (1649–1650), Мінску (1678–1679), Бабруйску (1687–1688), Магілёве (1682–1684), Мсціславе (1697), Слуцку (1697), Жодзішках (1709), Слоніме (1713), Мазыры (1728) і Юравічах (1756) [3 с. 55–72].

Пры распрацоўцы ўласнага збору педагагічных правілаў Ratio Studiorum езуіты здолелі знайсці ўдалы кампраміс паміж divina studia («боскія навукі») і studia humanitatis («чалавечыя навукі»), зрабіўшы асноўнай мэтай выхавання docta et eloquens pietas («вучоная і красамоўная набожнасць»). Пры такім падыходзе, здавалася, месца патрыятычнаму выхаванню не заставалася, бо хаця веды і атрымалі ў іх статус, роўны веры, але засноўваліся пераважна на антычнай спадчыне і ігнаравалі культурна-асветныя асаблівасці асобных еўрапейскіх народаў. Аднак пэўныя выпадкі патрыятычнага выхавання ў езуітаў, часам і не свядома, але ўсё ж прысутнічалі. Па-першае, зварот да антычнай літаратуры спрыяў знаёмству вучняў на занятках па лацінскай граматыцы і рыторыцы з шэрагам твораў, прасякнутых грунтоўнымі тэарэтычнымі разважаннямі наконт грамадзянскай адказнасці індывіда і неабходнасці выпрацоўкі ў яго актыўнай жыццёвай пазіцыі («Аб дзяржаве» і «Аб абавязках» Цыцэрона, «Законы» Платона, «Логіка» Арыстоцеля).

Праўда, далёка не ўсе з выхаванцаў глыбока ўдумваліся ў сэнс агучаных тут ідэй, бо настаўнікі найперш канцэнтравалі іх увагу на правапісе, цікавых словазваротах, стылі, а таксама на агульнай пабудове тэксту. Па-другое, для стымулявання пазнавальнай дзейнасці езуіты імкнуліся актывізаваць увагу вучняў праз пастаяннае захаванне эфекту навізны і актуальнасці – яны рэгулярна знаёмілі іх з найноўшымі еўрапейскімі выданнямі і тэорыямі. Прычым у школьных бібліятэках захоўваліся нават забароненыя Ватыканам кнігі – у Вільні студэнты акадэміі маглі прачытаць, напрыклад, кнігі Р. Дэкарта і Д. Лока, дзе гаварылася аб грамадзянскай супольнасці і роўнасці ўсіх саслоўяў перад законам. Па-трэцяе, для пашырэння кругагляду, адпаведна тэматыцы ўрока, настаўнікі закраналі асобныя пытанні, звязаныя з айчыннай гісторыяй, геаграфіяй, а таксама паўсядзённым побытам (абрады, адзенне, посуд, жыллё), але глыбіня падобных ведаў вучняў езуітаў не хвалявала – дадзеныя звесткі лічыліся другараднымі, бо яны павінны былі проста дапамагчы ў засваенні латыні. Па-чацвёртае, вельмі ўважліва езуіты ставіліся да фізічнага выхавання сваіх выхаванцаў. Павышаную цікавасць у моладзі заўсёды выклікала будаўніцтва пацешнай крэпасці, якую потым частка з іх заставалася абараняць, а іншыя «штурмавалі». Адбываліся і імітацыі знакамітых бітваў, што не толькі паглыбляла веды выхаванцаў у гісторыі, але і несла пэўную патрыятычную складовую – юнакі ўяўлялі сябе «ваярамі» Вітаўта, К. Астрожскага, Я. Радзівіла ці Я. Сабескага і марылі стаць такімі ж слаўтымі абаронцамі Радзімы [4, с. 126; 13, с. 77–84].

У цэлым можна прызнаць, што вучэбна-выхаваўчы працэс у езуітаў быў арганізаваны даволі эфектыўна. Аднак яго скіраванасць на дасканалае вывучэнне ўсяго некалькіх асноўных прадметаў (латынь, красамоўства, схаластычная філасофія) не дазваляла ім забяспечваць патрэбы грамадства вузкапрофільнымі спецыялістамі (юрысты, медыкі, бухгалтары, механікі, аграномы). З задачай выхавання сумленных грамадзян яны таксама яўна не спраўляліся – дэпутаты сеймаў Рэчы Паспалітай для аргументацыі ўласных выказванняў часцей прыбягалі да прыкладаў з антычных ці біблейскіх часоў, чым з айчыннай гісторыі.

Менавіта нежаданне езуітаў прыстасоўвацца да патрэб паўсядзённасці выклікалі па ўсёй Еўропе моцнае незадавальненне з боку прагрэсіўных колаў грамадства. Англійскі гісторык Г. Т. Бокль з гэтай нагоды пісаў: «В XVI в. иезуиты были передовыми людьми, а в XVIII в. они уже отстали от него» [14, с. 218]. Як вынік з гэтага ў еўрапейскіх краінах пачалі ўзнікаць альтэрнатыўныя ім школы пад патранажам розных грамадскіх і манаскіх асветніцка-дабрачынных арганізацый.

У Рэчы Паспалітай езуіты адчувалі сабе вельмі ўпэўнена і працяглы перыяд нават іншыя манаскія ордэны не маглі як след разгарнуць тут асветніцкую дзейнасць. Дамініканцы, напрыклад, на беларускіх землях мелі толькі адзін уласны калегіум, заснаваны пад Полацкам у в. Валынцы ў 1716 г. У сваю чаргу базыльяне, нягледзячы на наяўнасць у ВКЛ звыш за 2 млн уніятаў, з цяжкасцю адкрылі свецкія школы ў Барунах пад Ашмянамі (1700) і Жыровічах (1719). Пры гэтым іх вучэбныя праграмы цалкам капіравалі езуіцкія і вызначаліся значным кансерватызмам [15, с. 111]. Адзінымі ж рэальнымі канкурэнтамі езуітаў у рэгіёне сталі піяры – каталіцкі манаскі ордэн, заснаваны ў 1621 г. з мэтай пашырэння духоўнага выхавання. Запрасіў іх сюды ў 1641 г. кароль Уладыслаў IV з мэтай ліквідацыі манаполіі езуітаў

Рэпазіторый БДПУ

у адукацыйнай справе. Пры гэтым арганізацыя ў піяраў вучэбна-выхаваўчага працэсу першапачаткова практычна не адрознівалася ад езуіцкай, а таму рэальную пагрозу яны ім пакуль не неслі. Ды і сетка іх школ расла надзвычай марудна – у 1730 г. езуіты мелі ў Рэчы Паспалітай 63 школы з 50 тыс. выхаванцаў, тады як піяры маглі пахваліцца ўсяго 13 навучальнымі ўстановамі з 4 тыс. вучняў (на беларускіх землях яны ў той час былі ў Шчучыне (1726), Воранаве (1730) і Геранёнах (1730). Аднак пэўную небяспеку езуіты ўсё ж адчувалі, адзначаючы паступова нарастаючую колькасць пераходаў уласных вучняў у піярскія калегіумы [16, с. 53].

Для захавання кантролю над сітуацыяй езуіты ў 1730-я гг. пачалі працэс мадэрнізацыі ўласнай вучэбнай праграмы – больш часу яны пачалі адводзіць выкладанню дакладных дысцыплін, з’явіліся новыя курсы (гісторыя, геаграфія, логіка, этыка, французская і нямецкая мовы). Куды больш шырокім стала і іх разуменне ўласных педагагічных задач: «Мы занимаемся тяжелой работой по воспитанию молодежи единственно для хвалы Бога и добра Отчизны. Прежде всего будем стараться, чтобы молодые люди восприняли веру в Бога, добродетели, любовь к ближнему, верность Родине, уважение и благодарность к родителям». Найперш гэта праявілася ў істотных зменах у выкладанні латыні, пры вывучэнні якой шмат увагі пачало надавацца польскай мове – вучні павінны былі: «Каждое упражнение перевести с латыни на родной и обратно, сохраняя при этом как можно большую чистоту каждого из них». Аб узрослай увазе да яе сведчыць і патрыятычная па духу праца выкладчыка рыторыкі ў Вільні Ф. Багамольца «Размова аб польскай мове» (1752), дзе ён пісаў: «Основой и началом наук является знание родного языка. На нем нужно чисто как говорить, так и писать, не заражая его иностранными словами». Дадзенае сцверджанне ён удакладняў шматлікімі прыкладамі з антычнай гісторыі і заклікаў чытачоў зрабіць усё магчымае для славы сваёй Айчыны. Варта адзначыць, што праца Ф. Багамольца атрымала шырокую папулярнасць – вучні не толькі праходзілі яе на ўроках, але яшчэ і абавязаны былі напісаць самастойную работу з уласнымі разважаннямі на гэты конт [3, с. 51, 94].

Што ж датычыцца гісторыі, то як асобная дысцыпліна яна пачала чытацца езуітамі ў айчынных школах з 1749 г. (Гродна), а праз два гады ўжо выкладалася паўсюдна. Больш увагі тут надавалася ўсеагульнай і царкоўнай гісторыі, а мінулае Рэчы Паспалітай праходзілі разам з іншымі еўрапейскімі краінамі. Аднак такі падыход не задавальняў шмат каго з настаўнікаў, якія спрабавалі прыдаць гісторыі больш патрыятычны выгляд. Як вынік з гэтага з’яўляюцца першыя падручнікі па гісторыі ВКЛ. У 1763 г. у Вільне выйшлі «Хатнія звесткі аб Вялікім Княстве Літоўскім з дадаткам гісторыі яго народа» выкладчыка Полацкага езуіцкага калегіума Ф. Папроцкага. Айчынная гісторыя тут пачыналася з міфічнага Палемона і была даведзена ажно да 1569 г. У гэтым жа годзе ён выдаў працу «Найбольш значныя войны да нараджэння і пасля нараджэння Хрыста да Парыжскага і Губертусбургскага міру 1763 года», якую лічыў надзвычай актуальнай, бо: «Веданне гісторыі войнаў дазваляе высветліць прычыны ўзвышэння і падзення дзяржаў і, што асабліва важна, шляхі ўмацавання свабоды і незалежнасці Айчыны» [17, с. 118–119].

Рэгулярна на занятках езуітамі таксама сталі арганізоўвацца «сеймікі» – адзін з юнакоў абіраўся яго маршалкам, а іншыя прымалі ўдзел у абмеркаванні розных пытанняў, якія ў той час хвалявалі ўсё насельніцтва краіны. Пры гэтым «дэпутаты» вучыліся гаварыць пераканаўча, разважліва, сцісла і па сутнасці праблемы, а таксама прытрымлівацца рэгламенту і кантраляваць уласныя пачуцці і эмоцыі. У канцы ж «пасяджэння» маршалак падводзіў вынікі і спрабаваў сфармуляваць агульнае рашэнне, якое ставілася на галасаванне (з дазволам нязгодным вучням прымяніць права liberum veto). Вучэбна-метадычным дапаможнікам для правядзення падобных заняткаў стала выдадзеная ў 1742 г. у Вільні «Інструкцыя аб прамовах на сеймах і сейміках» з 13 узорнымі тэкстамі выступленняў, скіраванымі супраць пануючай у Рэчы Паспалітай шляхецкай анархіі [18, с. 412–413]. У дзённіку М. К. Радзівіла Рыбанькі ад 24 лютага 1745 г. застаўся запіс аб яго ўражаннях пасля наведвання падобнага мерапрыемства ў Нясвіжскім езуіцкім калегіуме: «Добрая гэта рэч дзеля спрыту хлапцоў, абы снадней мовілі і з прэзэнцыяй, дырэктарам быў мой сын Януш» [19, с. 181].

Не засталіся ў баку і піяры – ініцыятарам адукацыйных рэформ у ордэне стаў кіраўнік польскай правінцыі С. Канарскі. Сваё бачанне праблемы ён выказаў у творы De viro honesto et bono cive («Аб выхаванні сумленнага чалавека і добрага грамадзяніна»). Ідэал С. Канарскага – чалавек, які паважае і абараняе «ўсе правы чалавечага грамадства», вылучаецца маральнай чысцінёй, міласэрнасцю і спачуваннем да блізкіх, мае пачуццё абавязку ў адносінах да сяброў, знаёмых, падданых, улады і нарэшце – да Радзімы. Асобны акцэнт быў зроблены на падрыхтоўцы вучняў да актыўнага грамадскага жыцця – аўтар акрэсліў рысы, якія трэба абавязкова развіваць, каб падрыхтаваць моладзь да яго: любоў да Айчыны, пачуццё неабходнасці службы для яе: «умацавання, абароны і лепшай арганізацыі». Пры гэтым С. Канарскі заклікаў

Рэпазіторый БДПУ

захоўваць вернасць каралю, сенату і ўсім органам улады, падтрымліваць існуючыя парадкі, канстытуцыі і шляхецкія вольнасці: «Усё сваё жыццё ў дзяржаве неабходна патрэбы прыватныя ставіць на другое месца пасля інтарэсаў грамадскіх і недаравальна пачынаць у Рэчы Паспалітай смуту ды шкодзіць ёй» [20, с. 44–45].

Рэальнае ж увасабленне агучаных вышэй тэорый піяры пачалі ў 1740 г., калі ў Варшаве быў адкрыты Collegium nobilium – элітарная навучальная ўстанова з якасна новай вучэбнай праграмай, скіраванай на грамадска-патрыятычнае выхаванне дзяцей правячай эліты. Яе асаблівасць заключалася ў выкладанні на польскай мове, практычнай арыентацыі зместу дысцыплін, істотным пашырэнні цыклаў дакладных і прыродазнаўчых прадметаў, акцэнтаваннем увагі настаўнікаў на айчыннай гісторыі, літаратуры і мастацтве. Рэалізаваныя тут педагагічныя прыёмы прайшлі ўсебаковую праверку і ў далейшым сталі асновай для прыняцця агульнага для ўсіх піярскіх школ у Рэчы Паспалітай новага Школьнага статута, які быў зацверджаны ў 1754 г. (у ВКЛ уступіў у сілу ў 1762 г.). Згодна з ім галоўнай мэтай выхавання стала імкненне піяраў прывіць сваім выхаванцам: «Гарачую любоў да Айчыны, вернасць і паслухмянасць уладзе, а таксама павагу да правоў і дзяржаўных установаў» [21, с. 5–11].

Мадэрнізаваны вучэбны курс піяраў прадугледжваў выкладанне польскай мовы і гісторыі на працягу ўсяго тэрміну навучання. Асобнай дысцыплінай стала айчыннае права. Прычым для лепшага метадычнага забеспячэння двух апошніх прадметаў яны збіралі і выдавалі архіўныя крыніцы. Так, С. Канарскі выпусціў першыя 6 тамоў Volumina Legum (Варшава, 1732–1739), а М. Догель распачаў працу над «Дыпламатычным кодэксам Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага» – пры жыцці аўтара выйшлі 1 і 5 тамы (Вільня, 1758–1759), чацвёрты том пад рэдакцыяй Я. Выкоўскага і М. Тукалы надрукавалі ў Вільні ў 1764 г. (астатнія захаваліся ў рукапісе) [17, с. 121–125]. Згаданы ж вышэй твор С. Канарскага «Аб выхаванні сумленнага чалавека і добрага грамадзяніна» з'яўляўся абавязковым пры вывучэнні маралі – фактычна менавіта ён стаў першым айчынным дапаможнікам па патрыятычна-ідэалагічным выхаванні моладзі [22, с. 26–34]. Важную ролю адыгрывалі ў выхаваўчым працэсе і заняткі па рыторыцы. Вучням прапаноўвалася каля 200 тэм са свабодным выбарам для абмеркавання ў залежнасці ад «становішча ў краі і асабістай зацікаўленасці». У іх разглядаліся праблемы тагачаснай адукацыі, узаемаадносіны цэнтральнай улады і магнатаў, дзейнасць сеймаў, знешняя палітыка, фінансы, армія, гандаль, правы асобных саслоўяў і г. д. Часам яны выносіліся на вучнёўскія «сеймікі», якія ў піяраў праводзіліся публічна – у мясцовым касцёле. Настаўнікі раілі вучням весці сябе стрымана і разважліва, каб паказаць прыклад сапраўдным тагачасным дэпутатам. Да таго забаранялася выхаванцам ужываць права liberum veto, каб прадэманстраваць грамадству яго шкоднасць [23, с. 15–18].

Адзначым, што піяры зрабілі больш карыснага ў справе рэфармавання вучэбна-выхаваўчага працэсу, чым езуіты. Пацвярджаюць гэта і сучаснікі. У мемуарах тагачаснага паэта І. Быкоўскага занатавана: «Я, наведваючы школу езуітаў у Мінску ад Інфімы аж да Рыторыкі ведаў Альвар на памяць, хаця яго і не разумеў. Як зараз мяркую, то шкада было і маёй працы, і тых пяці год, што страціў без карысці ў час той адукацыі. У 1765 г. брат мой старэйшы Раман завёз мяне ў Віцебск і змесціў у канвікце ў ксяндзоў піяраў (*адкрыты ў 1751 г.* – А. С.). Там прабыў паўтары гады з куды большай карысцю…» [24, с. 474].

Відавочна, што манаская педагогіка ў Рэчы Паспалітай паступова ўсё ж пачала прыстасоўвацца да патрэбаў часу. Але ўзрастаючая патрыятычная складовая выхавання ў ордэнскіх школах найперш спрыяла паланізацыі насельніцтва ВКЛ. Адбывалася гэта на фоне ўзрастаючага «ліцвінскага сепаратызму», праявай якога было жаданне шляхты ВКЛ рознымі шляхамі адасобіцца ад «караняжаў» (палякаў). Свой адбітак яно знайшло ў тым ліку і ў моўнай сферы, дзе паступова набывала папулярнасць ужыванне народнай (беларускай) гаворкі. Зразумела, што развівалася яна ў пазашкольных умовах паўсядзённага жыцця (у тым ліку праз хатняе навучанне). Менавіта гэта дало падставу вядомаму айчыннаму даследчыку А. Мальдзісу далучыцца да высновы польскага гісторыка Я. Мацяеўскага аб тым, што: «Да канца XVIII ст. існавалі сярод шляхты ВКЛ групы, якія карысталіся выключна беларускай мовай, аднак шляхецтва іх ніколі не ставілася пад сумненне» [29, с. 93–94].


*Літаратура і крыніцы*

1. *Климов, С. М.* Базилиане : история ордена св. Василия Великого (базилиан) / С. М. Климов. – Могилев : МГУ, 2011. – 147 с.
2. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 352 с.
3. *Блинова*, Т. Б. Иезуиты в Беларуси (Их роль в организации образования и просвещения) / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 425 с.
4. *Жлутко, А.* Езуіты на Беларусі: пошукі праўды / А. Жлутко / 3 гісторыяй на «Вы». – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – Вып. 2. – С. 118–137.
5. *Андрэева, Е. Г.* Асвета ў старажытнай Беларусі і Вялікім Княстве Літоўскім / Е. Г. Андрэева. – Мінск : БДПУ, 2000. – 46 с.


Рэпазіторый БДПУ

6. *Корнилова, Л. А.* Католические монашеские ордена в ареале культурной традиции восточно-славянских народов ВКЛ (XVI–XVIII вв.) / Л. А. Корнилова / Весн. Гродзен. дзярж. ун-та. – Сер. 1. – 2007. – № 4. – С. 58–66.
7. *Новицкая-Ежова, А.* Орден базилиан и его культурно-просветительская деятельность на украинско-белорусско-литовских землях Речи Посполитой / А. Новицкая-Ежова // Славяноведение. – 1996. – № 2. – С. 33–47.
8. *Stasiewicz-Jasiukowa, I.* Rola oświeconego katolicyzmu w rozwoju myśli naukowej i pedagogicznej we wczesnym polskim Oświeceniu / I. Stasiewicz-Jasiukowa // Analecta : studia i materiały z dziejów nauki. – 1998. – T. 7. – № 1. – S. 79–92.
9. *Слюнькова, И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций. Наследие архитектуры Беларуси / И. Н. Слюнькова. – М. : Прогресс-Традиция, 2002. – 600 с.
10. *Karbowiak, A.* Dzieje wychowania i szkól w Polsce : w 3 t. / A. Karbowiak. – Lwów – Warszawa – Kraków : Wyd- wo zakładu narodowego im. Ossolińskich, 1923. – T. 3. – 1923. – 564 s.
11. *Джуринский, А. Н.* История образования и педагогической мысли / А. Н. Джуринский. – М. : Изд-во «Владос-Пресс», 2003. – 400 с.
12. *Андреев, А. Р.* История ордена иезуитов. Иезуиты в Российской империи. XVI – начало XIX века / А. Р. Андреев. – М. : Русская панорама, 1998. – 201 с.
13. Учебные заведения Литвы до присоединения ее к России / Журнал Министерства Народного Просвещения. – 1862. – № 10. – С. 77–84.
14. *Губер, Ж.* Иезуиты: их история, учение, организация и практическая деятельность в сфере общественной жизни, политики и религии / Ж. Губер. – СПб. : Изд. Ф. Павленкова, 1898. – 320 с.
15. *Киприанович, Г. Я.* Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего до настоящего времени / Г. Я. Киприанович. – Вильна : Тип. И. Блюмовича, 1895. – 235 с.
16. *Bieńkowski, T.* Na przełomie epok : edukacja na ziemiach polskich w latach 1720–1740 / T. Bieńkowski / Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1996. – T. 37. – S. 51–67.
17. *Бирало, А. А.* Философская и общественная мысль Белоруссии и Литвы в конце XVII – середине XVIII в. / А. А. Бирало. – Минск : Изд-во БГУ, 1971. – 178 с.
18. *Bednarski, S.* Upadek i odrodzenie skol jezuickich w Polsce. Studium z dziejow kultury i szkolnictwa polskiego / S. Bednarski. – Kraków : Wyd-wo księży ezuitow, 1933. – 538 s.
19. Дыярыюш Князя Міхала Казімера Радзівіла, Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В. К. Літ. // Спадчына. – 1995. – № 1. – С. 170–199.
20. *Bartnicka, K.* Koncepcje wychowania obywatelskiego i patriotycznego w szkołach Komisji Edukacji Narodowej / K. Bartnicka / Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1973. – T. 16. – S. 41–67.
21. *Majchrowicz, F.* Wielka reforma czkolna ks. Stanislawa Konarskiego i Komisji Edukacji Narodowej / F. Majchrowicz. – Lwow–Warszawa : Ksiaznica Polska, 1923. – 80 s.
22. *Kot, S.* Reforma czkolna Stanislawa Konarskiego / S. Kot. – Kraków : Druk. W. Anczyca i Spolki, 1923. – 40 s.
23. *Kurdybacha, Ł.* Reforma litewskich szkół pijarskich w 1762 r. / Ł. Kurdybacha / Rozprawy z Dziejów Oświaty. – 1972. – T. 15. – S. 3–23.
24. *Mikulski, T.* Ze studiów nad Oświeceniem. Zagadnienia i facty / T. Mikulski. – Warszawa : Państwowy instytut wydawniczy, 1956. – 555 s.
25. *Мальдзіс, А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 479 с.



*Summary*

*The research article is devoted to the historiographical unexplored problem of the evolution of patriotic education in monastic schools in the national education of XVI – XVIII century. The basic reasans of its negative graduation and factors which inftenced the destuction of «Christian Cjsmopolitanism» mith he proper correction of Ribbon Schods' curricylum content are revealed. The main elementsof the patriotic education in the jesuits pedagogy are displayed the directions of neodemization of the educational process in the jesuits and piars schodes in the XVIII century are warned. The maind author's attention is devoted to the teaching of history, morality, law and retoricofpatriotic and line character. Theguestion of the Belarusian "lithuanian" self-consciousness in monastic education of that time is considered.*


Паступіў у рэдакцыю 28.01.2015 г.

*УДК 930(476)"18/19":[37:27–789.5]*


***Т. І. Палікоўская,***

*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ*


# АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. ГІСТОРЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЕЗУІТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Гісторыя дзейнасці манаскага каталіцкага ордэна езуітаў у сферы асветы на беларускіх землях – неад'емная частка мінулага Бацькаўшчыны. Для дакладнага разумення аб'ектыўнага мінулага асэнсавання ролі ордэна езуітаў у развіцці адукацыі на тэрыторыі Беларусі патрэбна назапасіць багатую крыніцазнаўчую і гістарыяграфічную базу. Толькі яе дэталёвы аналіз дапаможа нам скласці сапраўдную гісторыю тых падзей,

Рэпазіторый БДЭУ